Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 СНЕЖНЯ 2017 г. СУБОТА №243 (28607)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Дзе вытокі нашай дзяржаўнасці?

СТАР. 5



## Айчыннаму кіно — 93 гады

СТАР. 8



## Як палітыка ўплывае на спорт?

СТАР. 13

# Першая пасля Скарынавай




Фота БЕЛТА.

Учора ў Брэсце да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ўстанавілі памятны знак Брэсцкай Біблії. Брэсцкая друкарня, заснаваная Мікалаем Радзівілам Чорным у 1553 годзе, была першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі, як і выдадзеная ў ёй праз дзесяць гадоў Біблія.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АРЛОЎСКІ, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь:**

*«З 1 студзеня 2018 года ў шэрагу выпадкаў рашэнні аб рэгістрацыі дэкларацыі на тавары, сама рэгістрацыя, а таксама рашэнні аб выпуску тавараў могуць прымацца інфармацыйнымі сістэмамі аўтаматычна, без удзелу інспектара. Аўтаматычны выпуск тавараў, замацаваны ў Мытным кодэксе Еўразійскага эканамічнага саюза, першай на тэрыторыі ЕАЭС укараніла менавіта беларуская мытня».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0257 | ▼ |
| Еўра | 2,3882 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0344 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0732 | ▼ |

■ Перспектыва

## «ЭЛЕКТРАЖЫЛЛЁ» ЎЖО НЕ ФАНТАСТЫКА

### Адраснае субсідаванне налета будзе сканцэнтравана на шматдзетных сем'ях



Фота БЕЛТА.

**У гэтай пяцігодцы запланаваны ўвод у эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі і, адпаведна, выпрацоўкі электрычнай энергіі. У сувязі з гэтым ужо з 2017 года пачалося праектаванне новых жылых дамоў для будаўніцтва іх з 2018 года з разліку прымянення электрычнасці не толькі для гатавання ежы, але і для абагравання і атрымання гарачай вады. Аб блізкіх перспектывах будаўніцтва жылля ў нашай краіне «Звяздзе» расказаў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ.**

СТАР. 4

■ Сітуацыя

## ДОМ НА СЯМІ ВЯТРАХ...

### Ініцыятыўны мінчанін спрабуе навесці парадак у шматпавярхоўцы

**Як часта мы, стаміўшыся на працы ці пагрузіўшыся ва ўласныя праблемы, не звяртаем увагі на бытавыя недахопы. Перагарэла лямпачка ў пад'ездзе — пачакаем, пакуль пытанне вырашыць хто-небудзь з суседзяў, непрыемны пах — па лесвіцы можна ісці і трохі хутчэй. І такія хібы пачынаюць назапашвацца як снежны ком, пакуль за домам трывала не замацоўваецца слава «праблемнага».**

### «Незабыўны» пах

Аднак з такой сітуацыяй мірыцца гатовыя не ўсё. Калькасць звароту да камунальных службаў з нагоды дома па адрасе Убарэвіча, 38, корпус 2 рэзка вырасла пасля таго, як у верасні гэтага года кватэру ў ім набыў Сяргей Гаркоўскі. Гісторыя пачыналася добра: яшчэ гадоў 10 таму мужчына здымаў тут кватэру, умовы яму вельмі падабаліся, да таго ж ён заўсёды хацеў жыць на першым паверсе, так што пры куплі «сышліся зоркі». Аднак радасць набыцця жылля вельмі хутка азмрочыла з'яўленне ўстойлівага непрыемнага паху, які ахутаў усю кватэру. На пытанні Сяргея мясцовыя жыхары толькі разводзілі рукамі: гэта яшчэ кветачкі, вось летам...

Аказалася, што ў доме з перыядычнасцю мінімум раз у тыдзень забіваецца каналізацыя, у сувязі з чым спецыфічнае «амбрэ» ў літаральным сэнсе слова атакуе жыхароў першага паверха. Сяргей прывыкаць да гэтага быў не гатовы, таму пачалося яго «хаджэнне па пакутах», а дакладней, этапея са зваротамі ў розныя інстанцыі.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

17243

9 771990 763008

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У першых нумарах 2018-га — календары: насценны, рэлігійны і народны

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!